# Книжные новинки






Среди авторов этой книги есть хорошо известные, как, например, Елена Попова – писатель и драматург, или Зинаида Красневская – высококлассный переводчик с английского, автор житейских историй о прошлом и настоящем, а есть и авторы пока малоизвестные и – чрезвычайно талантливые, как Елена Афанасьева, способная открыто признаться в своих чувствах, Вера Зеленко, увлекательно рассказавшая о жизни знаменитого актёра, Мара Русова, поведавшая о трудной судьбе еврейской семьи. Авторы книги, наши белорусские писательницы, каждая по-своему рассказывают о жизни современного человека и общества.




Всем известно, что домовой охраняет благополучие своего хозяина, уют и порядок в его доме. Вот и герои данного произведения – малыши-домовята – направляются на поиски хозяев. По пути им предстоит выдержать немало испытаний, познакомиться с различными прелюбопытнейшими персонажами. Книга учит быть добрым, честным, отзывчивым.




Подростки – сложный народ. Их внутренний мир порой кажется непостижимым, неосвоенным космосом, масштабы которого не вписываются в общепринятые нормы. Можно ли найти точки соприкосновения между поколениями и достучаться до тинейджеров, которые зачастую ведут себя вызывающе, но при этом обладают большей свободой мысли и глубиной рассуждений, чем их предшественники? На этот философский вопрос попыталась ответить автор повести «Ботан» Ирина Карнаухова.




У новую кнігу лаўрэата Нацыянальнай літаратурнай прэміі і шматлікіх іншых рэспублікан скіх і міжнародных літаратурных прэмій, заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь Міхася Пазнякова ўвайшлі вершы, скорагаворкі, загадкі, якія знаё мяць юных чытачоў з рознымі відамі чалавечага жылля – ад старажытнай пячоры да сучасных хмарачосаў, а таксама – з жытлом звяроў, птушак і насякомых. Творы маюць адметнае пазнавальнае і выхаваўчае значэнне.




Гэты зборнік склалі вершы і апавяданні пераважна класікаў беларускай літаратуры: Пятра Глебкі, Петруся Броўкі, Пімена Панчанкі, Міхася Лынькова, Аркадзя Куляшова... Даступнай юным чытачам мовай пісьменнікі размаўляюць з імі пра спрадвечныя каштоўнасці: любоў да Радзімы і роднай мовы, памяць пра наша гераічнае мінулае і пра тое, чаму людзі павінны шанаваць мір, як важна добра вучыцца і любіць сваю сям'ю.




"Трэмс-тамс-та́ць!" – прамовіць чараўнік, узмахне чарадзейнай палачкай і – адбудзецца нешта казачна неверагоднае. Але ў жыцці магічныя замовы, як вядома, не працуюць... А фантазія? На яе забыліся? Варта толькі крыху памарыць – і пачнуць з'яўляцца на свет рыжыя коткі на пуантах, ружовыя пяшчотазаўры, пацешныя хатнічкі Прачну́ці, якія нябачна будзяць людзей уранку, і іншыя смяшлівыя асобіны дзівакаватага выгляду. Так што, сябры, кожны з нас можа стаць чараўніком, калі вельмі таго захоча. Адкрываем новую кнігу – прыйшла пара чараваць!




Назвай кнігі стала не назва змешчанага ў ёй рамана "Забранае шчасне", а адной з дзвюх яе аповесцей — "Анёлак мой. Анёлак... Гэта не выпадкова, бо тры творы У. Гаурыловіча — раман і дзве аповесці — знітоувае тэма кахання. Адрозненне твораў— у храпалагічным фоне і гістарычных абставінах раскрыцця тэмы: у аповесцях — пачатак XXI стагоддзя. у рамане — 30-я гады мінулага стагоддзя, асноўнай падзеяй якіх стала калектывізацыя, з якой былі звязаны часцей за ўсё лёсы нешчаслівыя і адначасова такія незабыўныя гіа сваім унутраным чалавечым характве. Падзеі. адлюстраваныя ў творах У. Гаурыловіча, адбываюцца ў глыбінны Палесся. Для шырокага кола чытачоў




У творы Святланы Быкавай у паэтычнай форме ўвасабляецца легенда пра полацкую княжну Рагнеду і яе мужнага сына Ізяслава. Гістарычная паэма ўключана ў вучэбную праграму па беларускай літаратуры для 6-га класа.




Книга посвящена жизни и творчеству известного белорусского художника монументалиста, лауреата Государственной премии Республики Беларусь Валерия Тимофеевича Довгало. Он принадлежит к так называемому среднему поколению художников, которые сегодня составляют ядро национальной изобразительной культуры страны. В его творческом багаже активное участие в проектировании и реализации художественно эстетического оформления интерьеров таких крупных объектов в Минске..Художническое лицо его всегда узнаваемо - лицо целеустремлённого, вдумчивого, трудолюбивого и, главное, талантливого Мастера, цель которого - научить людей любить и понимать Искусство, в котором историческая память народа духовными нитями неразрывно связана с реалиями дня сегодняшнего.Для широкого круга читателей.




Галоўная гераіня кнігі – вясёлая і цікаўная лісачка Красуня. Раней яна жыла ў мегаполісе, а потым малечы пашанцавала вырвацца з тлуму вялікага горада і пасяліцца ў Дзівосным лесе, дзе яе выхавацелем стаў вялікі, моцны і добры мядзведзь Буры. Красуня знайшла сярод лясной дзятвы шмат сяброў, якім з гэтай мілай фантазёркай сумаваць ніколі не даводзіцца! Пра вясёлыя прыгоды, цікавыя забавы, неверагодныя здарэнні і дэтэктыўныя гісторыі і раскажа гэта кніга. Лісачка запрашае чытачоў у Дзівосны лес! Уваход – пад вокладкай!




Канікулы, святы і цудоўны сюрпрыз: да дзяўчынкі Улады прыляцеў яе іншапланетны сябар Вухуцік! Адразу пачынаюцца цікавыя падзеі, неверагодныя здарэнні і вясёлыя прыгоды, але Улада заўважае, што хлопчыка нешта сур'ёзна турбуе. Ён трымае сваю праблему ў таямніцы і не скардзіцца, бо не хоча псаваць святочны настрой. Пакуль сітуацыя не вымушае яго...




У гэты зборнік увайшлі новыя казкі вядомага паэта Міколы Чарняўскага, якія, спадзяемся, стануць цудоўным працягам знаёмства і незвычайнага падарожжа ў чароўны і таямнічы свет казачных з'яў і вобразаў, жывога мастацкага слова, прыбавяць юных чытачоў трапнасцю аўтарскіх знаходак, займальнасцю прыдуманых ім прыгодніцкіх гісторый.




Багата ілюстраваная чытанка «Верасок» складаецца з тэматычных раздзелаў. Выданне разлічана на цікаўнага маленькага чытача і яго бацькоў. Таксама кнігу можна выкарыстоўваць для падрыхтоўкі заняткаў і ранішнікаў у дзіцячым садку, урокаў і пазакласных мерапрыемстваў у пачатковай школе.